# *МАНАЛОГ, ДЫЯЛОГ І НЕ ТОЛЬКІ*



**20 лістапада 2024 года ў гродзенскім офісе Саюза пісьменнікаў Беларусі, што знаходзіцца ў самым сэрцы гістарычнага цэнтра горада над Нёманам, прайшлі чарговыя заняткі створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ Грамадскай літаратурнай школы. Тэма занятку: «Кампазіцыя твора. Маўленчыя элементы: маналог і дыялог».**

Занятак наведалі аматары літаратуры і літаратурнай творчасці рознага ўзросту, прадстаўнікі Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб'яднання «Надежда». Пачалі па традыцыі з тэорыі. Слухачам грамадска-адукацыйнага праекта былі прапанаваны вызначэнні маналогу і дыялогу, якія зноў (праз год) апынуліся ў сферы нашай увагі. Але цяпер – у кантэксце вывучэння маўленчых элементаў кампазіцыі. Асноўныя функцыі маўленчых элементаў кампазіцыі, віды маналогу і дыялогу, а таксама некаторыя асаблівасці іх выкарыстання ў кампазіцыі мастацкага твора – усё гэта, а таксама шэраг паралельных, не менш актуальных пытанняў літшкола разгледзела ў зладжаным, канструктыўным рэжыме. Былі прадстаўлены прыклады маўленчых элементаў кампазіцыі з бібліятэчкі СПБ-Гродна. Прагучалі выступленні кожнага са слухачоў. Пасля чаго вынікі індывідуальнай працы прайшлі калектыўнае абмеркаванне. Не абышлося і без экспромтаў. Калектыў аднадумцаў сутыкнуўся з шэрагам складаных практычных пытанняў, якія здолеў вырашыць дзякуючы высокаму ўзроўню ўзаемаразумення і ідэйнаму адзінству калег.




Таксама ў рамках сустрэчы закраналіся стратэгічныя пытанні – стасункаў з выдаўцамі, зваротнай сувязі з рэдакцыямі часопісаў і газет, якія далёка не заўсёды з'яўляюцца дастаткова спрыяльнымі і патрабуюць больш уважлівага, аб'ектыўнага падыходу. Зрэшты, як і паняцці дыялогу ды маналогу ва ўмовах перанасычанай, часам агрэсіўнай інфармацыйнай прасторы.

Гродзенская грамадская літаратурная школа працягвае знаёмства з маўленчымі элементамі кампазіцыі. Тэма наступнай, снежаньскай сустрэчы – «Кампазіцыя твора. Маўленчыя элементы: лірычныя адступленні».

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** падчас чарговага занятку ў Гродзенскай грамадскай літаратурнай школе, эксклюзіўнага грамадска-адукацыйнага праекта Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі; тэма «Кампазіцыя твора. Маўленчыя элементы: маналог і дыялог». Офіс СПБ-Гродна, 20 лістапада 2024 года.








Жыццёвыя
путы






2024


НОЯБРЬ













Пра тое, як праходзілі папярэднія заняткі, **– тут.**

**www.pisateli.by**